**Бізнес-беларуская.**
Мэта курсу: сфармаваць трывалую лексічную і граматычную базу, неабходную для вядзення бізнес-камунікацыі; удасканаліць навыкі маўлення ў акрэсленых сітуацыях, звязаных з дзелавой актыўнасцю; удасканаліць навыкі вядзення дакументацыі і перапіскі на беларускай мове.

1. **Уводзіны**. Стылістычныя асаблівасці беларускай мовы. Дыягностыка ўзроўню ведаў і чаканняў аўдыторыі. (1 занятак)
2. **Арганізацыя**.
   Тэмы вусных абмеркаванняў: апісанне арганізацыі, структурныя часткі арганізацыі, эфектыўная камунікацыя «каманды».
   Пісьмовыя тэксты/дакументы: статут, службовая запіска, заява.
   Лексічны/граматычны матэрыял: лексіка па тэме, правапіс складаных словаў, правапіс іншамоўных словаў, скланенне назоўнікаў у родным склоне (-у ці –а)
   (2 заняткі)
3. **Кадры**
   Тэмы вусных абмеркаванняў: арганізацыя працы з персаналам, што чакаецца ад добрага працаўніка, правядзенне сумоўя, працоўныя абавязкі, будаванне карпаратыўнага духу
   Пісьмовыя тэксты/дакументы: CV, складанне аб’явы, працоўная дамова, загад аб прыёме на працу
   Лексічны/граматычны матэрыял: лексіка па тэме, ужыванне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў, ступені параўнання прыметнікаў, скланенне і правапіс займеннікаў
   (2 заняткі)
4. **Рынак**
   Тэмы вусных абмеркаванняў: якасць тавараў і паслуг, пошук адпаведнага сегменту, фармаванне і прамоцыя маркі, беларускамоўная рэклама.
   Пісьмовыя тэксты/дакументы: камерцыйная прапанова, рэкламны тэкст, рахунак-фактура, акт выкананых прац
   Лексічны/граматычны матэрыял: лексіка па тэме, скланенне уласных назоўнікаў, род і лік назоўнікаў
   (2 заняткі)
5. **Перамовы**
   Тэмы вусных абмеркаванняў: партнёры ў дзелавой актыўнасці, падрыхтоўка да перамоваў, атмасфера на перамовах: як зняць напружанасць, канфлікты і іх вырашэнне
   Пісьмовыя тэксты/дакументы: ліст аб намерах, дамова куплі-продажу, акт выкананых прац
   Лексічны/граматычны матэрыял: лексіка па тэме, выражэнне мадальнасці ў беларускай мове, ужыванне мадальных словаў, злучнікі і злучальныя словы, правапіс прыслоўяў, правапіс і, ы, й пасля прыставак.
   (2 заняткі)
6. **Этыка**
   Тэмы вусных абмеркаванняў: грошы і прынцыпы, сацыяльная адказнасць метады прыняцця рашэнняў, лідарства ў бізнесе.
   Пісьмовыя тэксты/дакументы: інтэрвію у прэсе, даверанасць
   Лексічны/граматычны матэрыял: лексічны матэрыял па тэме, лічэбнікі, скланенне колькасных лічэбнікаў, формы ацэнкі і меры якасці прадметаў.
   (2 заняткі)
7. **Заключны занятак**
   Падсумаванне, варыянты беларускай мовы.

Літаратура:
Беларуская мова. У дзвюх частках. Пад агульнай рэдакцыяй Л. М. Грыгор’евай.
Шаблоны для вусных практыкаванняў з New Market Leader, FT
Пісьмовыя крыніцы: case study.